Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 31 (100)
ЧАЦВЕР
8
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Узорна падрыхтавацца да першай совецкай вясны

Збылася адвечная мара сялян аб зямлі. Воляй народа землі памешчыкаў і манастыроў канфіскаваны і раздзелены паміж сялянамі. Дзесяткі тысяч батракоў, беззямельных і малазямельных сялян атрымалі лепшыя ўрадлівыя землі, на якіх яны гадамі гнулі свае спіны, абагачаючы кучку паразітаў-памешчыкаў. Зямля больш не можа быць прадметам куплі і продажу. Адпала ранейшая за пазычанасць сялян за арэнду зямлі ў памешчыкаў, якая вісела непасільным цяжарам на дзесятках тысяч малазямельных і сярэдніх гаспадарак.

На дадным гістарычным адрэзку часу падзел зямлі ставіць матэрыяльную базу для ўздыму становішча былых беззямельных і малазямельных сялян. Селянін, які вякамі марыў аб зямлі, верыць, што дробная гаспадарка не адзіны шлях збаўлення ад нішчаты. Сяляне, атрымаўшыя зямлю, заклапочаны зараз тым, як лепш правесці першую совецкую пасеўную кампанію, іх хвалююць многія пытанні аб цягавай сіле, аб насенні, аб інвентары і г. д.

Зусім відавочна, што партыйныя, совецкія і зямельныя органы не могуць стаяць у баку ад прадстаячай пасеўнай кампаніі. Для нас не можа быць абыякавым, як сяляне рыхтуюцца да сяўбы, як яны забяспечваць ураджайнасць сваіх зямель. Мы абавязаны ўнікнуць ва ўсе дробязі і дапамагчы сялянам правесці веснавую сяўбу ў раннія тэрміны на высокім агратэхнічным узроўні.

Якія пытанні ўзнікаюць у сялян, і ў чым мы абавязаны ім дапамагчы?

Па-першае, звыш 20 проц. сялянскіх гаспадарак па нашай вобласці, асабліва з ліку былых батракоў і малазямельных сялян, не маюць коней. Мы абавязаны арганізаваць справу так, каб тыя сялянскія гаспадаркі, якія маюць коней па аднаму ці два, на добраахвотных пачатках дапамаглі-б бясконным сялянам апрацаваць іх участкі зямлі.

Па-другое, частка гаспадарак, асабліва з былых батракоў, не поўнасцю забяспечана насеннем. Сялянскія камітэты абавязаны дэталёва ўлічыць, колькі маецца такіх гаспадарак, і аказаць ім дапамогу. Гэта дапамога можа выразіцца ў тым, што ў парадку масавай работы адны гаспадаркі пазычаць другім да восені частку насення, а частку прыдзецца выдаць як дзяржаўную пазыку з канфіскаваных ураджаяў былых маёнткаў.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб хутчэйшым заканчэнні абмалоту ўраджаяў былых маёнткаў. Па даных, якімі распалагае аблзо, абмалочана толькі 70 проц. ураджаю. У Бельскім і Лапскім раёнах абмалочана ўсяго 50 — 60 проц. Пры наяўнасці ў вобласці 180 складаных малатарняў і звыш 100 лакамабіляў абмалот можа і павінен быць закончан у бліжэйшыя дні. Сялянскія камітэты і райвыканкомы павінны арганізаваць дакладны ўлік усяго насення і арганізаваць строгую ахову, каб ніводзін кілограм насення не быў раскрадзен.

У былой Польшчы большасць сялянскіх гаспадарак сеяла нечачышчаным насеннем. Мы абавязаны дабіцца, каб сялянскія гаспадаркі засеялі веснавы клін ачышчаным насеннем. У гэтым пытанні аблзо дапусціла паўнейшы самацёк. Гэта становішча павінна быць карэнным чынам зменена.

Не маловажнае значэнне мае падрыхтоўка і рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Спажывецкая кааперацыя абавязана завезці ў бліжэйшы час ў вёскі неабходнае жалеза. Сялянскія камітэты павінны ў кожнай вёсцы арганізаваць работу кузняў. Трэба пайсці па лініі арганізацыі грамадскіх кузняў на кааператыўных пачатках калектыўнага выпальвання вугалю. Такія грамадскія кааператыўныя формы сыграюць вялікую ролю ў вясеннай сяўбе.

Поспех веснавой сяўбы будзе цалкам залежаць ад работы, ад ініцыятывы сялянскіх камітэтаў. Але гэтымі камітэтамі трэба кіраваць. На чале камітэтаў сядзяць людзі, якія яшчэ не маюць вопыту арганізацыйнай работы, яны дапускаюць нямала памылак. У рад камітэтаў прабраліся варожыя элементы, якія наўмысля будуць імкнуцца напаскудзіць у рабоце. Задача заключаецца ў тым, каб па-большэвіцку кіраваць сялянскімі камітэтамі. Ці можна мірыцца з такім стылем кіраўніцтва, які ажыццяўляе Лапскі райком партыі. Сакратар райкома тав. Русанаў за два месяцы пабываў толькі ў двух сялянскіх камітэтах. Не дзіва, што Лапскі раён вельмі дрэнна рыхтуецца да сяўбы.

У сувязі з разгарнуўшайся выбарчай кампаніяй, у вёсцы наглядна ўтвараецца вялікі палітычны і вытворчы ўздым. Сяляне арганізуюць чырвоныя абозы па продажу хлеба дзяржаве, разгортваюць работу па будаўніцтву дарог і мастоў. Гэты ўздым трэба накіраваць на ўзорную падрыхтоўку і правядзенне першай совецкай веснавой сяўбы.

—«о»—

ПОЛИЦЕЙСКИЙ НАЛЕТ НА СОВЕТСКИЕ УЧРЕЖДЕНИЯ В ПАРИЖЕ.

5 февраля с. г. в 9 часов 30 минут утра, в помещение Торгпредства СССР в Париже ворвалось до 100 человек, одетых в гражданское платье. Дежурящему в Торгпредстве сотруднику было заявлено, что все лица прибыли для производства обыска по устному распоряжению префекта полиции. Выключив все телефонные аппараты, агенты полиции проникли в служебный кабинет и квартиру и. о. Торгпреда тов. Евстратова, где и приступили к обыску, несмотря на его протесты. Обыск в Торгпредстве сопровождался из'ятием документов и взломом шкафов и сейфов. Сотрудники Торгпредства, явившиеся на службу, были задержаны и под охраной полиции разведены по их квартирам, где также был произведен обыск. Одновременно такой же обыск был произведен в помещениях Интуриста и бывшей советской школе в Париже. После этого задержанные сотрудники были освобождены.

Немедленно по уведомлении о происходящем обыске, полпред СССР в Париже тов. Суриц направил в Торгпредство двух сотрудников, с требованием немедленно очистить помещение и вернуть из'ятые документы.

После того, как полиция отказалась удовлетворить эти требования, т. Суриц в 17 часов того же числа заявил французскому правительству протест против действий полицейских властей, настаивая на прекращении обыска и на возвращении Торгпреду всех из'ятых документов.

(ТАСС)



Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства капітану **Н. С. Угрумаву** прысвоена званне Героя Совецкага Саюза, а старшаму лейтэнанту **Д. Л. Маргулісу** прысвоена званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Золотая Звезда».

На здымку (слева направа): Капітан **Н. С. Угрумаў** і старшы лейтэнант **Д. Л. Маргуліс.** (Фото-клішэ ТАСС).

Прысваенне звання Героя Совецкага Саюза начальніцкаму саставу Чырвонай Арміі

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства званне **Героя Совецкага Саюза** з уручэннем **ордэна Леніна і медалі „Золотая Звезда“** прысвоена: лейтэнанту **Белову** Івану Міхайлавічу, палітруку **Капусціну** Владзіміру Дзімітрыевічу, старшаму палітруку **Панамарчуку** Сцепану Ефрэмавічу, маладшаму камандзіру **Парасёнкаву** Паўлу Фёдаравічу (ТАСС).

Узнагароджанне начальніцкага і радавога састава Чырвонай Арміі

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза ўзнагароджана 248 чалавек начальніцкага і радавога састава Чырвонай Арміі.

Ордэнам Леніна ўзнагароджана 14 чалавек, ордэнам „Красное Знамя“—69 чалавек, ордэнам „Красная Звезда“—46 чалавек, медалью „За отвагу“—68, медалью „За боевые заслуги“ — 51 чалавек. (ТАСС).

ОПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 6-га лютага на фронце адбываліся пошукі разведчыкаў, на поўнач ад Ладажскага возера прадаўжаліся сутычкі дробных пяхотных часцей.

Наша авіяцыя рабіла разведчыя палёты.

Падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР

Сход жанчын гор. Беластока

5 лютага ў памяшканні гарадскога тэатра адбыўся сход работніц-тэкстыльшчыц гор. Беластока і жонак каманднага састава Чырвонай Арміі беластоцкага гарнізона. На сходзе прысутнічала больш 1000 жанчын.

Сход пад бурныя апладысменты выбраў у ганаровы прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б).

З дакладам аб задачах, стаячых перад жанчынамі у выбарчай кампаніі, выступіў тав. Токараў.

Пасля даклада выступіла работніца першага тэкстыльнага камбіната тав. Эпштэйн.

— Толькі совецкая ўлада,— гаворыць тав. Эпштэйн, — клапоціцца аб працоўнай жанчыне, стварае нам магчымасць спакойнай працы на прадпрыемствах. На першым камбінаце адкрыты яслі. Больш 40 дзяцей работніц, акружаныя клопатамі, знаходзяцца ва ўтульным памяшканні. Работніцы спакойна працуюць на фабрыцы. Я шчаслівая, што дажыла да таго часу, калі аб нашых дзецях праяўляюць такія клопаты.

Выступалі таксама жонка маёра тав. Проніна і жонка старшага палітрука тав. Світыдэнка.

Пад бурныя апладысменты сход пасылае прывітанні правадыру працоўных таварышу Сталіну, главе Совецкага ўрада тав. Молатаву і Наркому Абароны, першаму маршалу Совецкага Саюза тав. Варашылаву.

Сход аднагалосна прыняў зварот да ўсіх працоўных жанчын-выбаршчыкаў заходніх абласцей Беларусі, у якім заклікае іх прыняць актыўны ўдзел у правядзенні выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Вечар закончыўся канцэртам, у якім прымалі ўдзел лепшыя артыстычныя сілы горада Беластока.

Агульна-гарадскі сход настаўнікаў

6 лютага ў тэатры Палас адбыўся сход настаўнікаў гор. Беластока, прысвечаны выбарчай кампаніі. На сходзе прысутнічала каля 800 чалавек.

З дакладам аб задачах настаўніцтва ў выбарчай кампаніі выступіў першы сакратар абкома КП(б)Б тав. Ігаеў.

На сходзе выступалі загадчык горана тав. Бухтаровіч, дырэктар 7 сярэдняй школы тав. Кестэнблат, намеснік старшыні аблсаюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы тав. Фінкельштэйн і інш.

Агульны сход прыняў пісьмо да таварыша Сталіна, у якім выражае ўпэўненасць, што ўсе настаўнікі пойдуць да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за лепшых сыноў Краіны.

Участкі ўпрыгожваюцца

Крынкі. Закончана работа па камплектаванню ўчастковых выбарчых камісій і падбор памяшканняў для выбарчых участкаў. Усяго ў раёне створана 30 выбарчых участкаў. Для іх падабраны лепшыя памяшканні, якія зараз абсталёўваюцца і ўпрыгожваюцца лозунгамі і партрэтамі. Выбарчыя ўчасткі ў мястэчку Крынкі абсталяваны ў памяшканні клуба, школы і памяшканні РК КП(б)Б.

На ўсіх участках пачалі работу гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. У гуртках займаецца больш 1000 сялян.

ПА СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

1018 ПРОЦАНТАЎ НОРМЫ

З чэсцю выконвае свае абавязацельствы калектыў вагонарамонтнага пункта станцыі Мінск. Месячны план за студзень па выпуску таварных вагонаў выканан на 114 процантаў. Звыш плана дана 7 вагонаў. Стаханаўцы пункта паказваюць высокія ўзоры павышэння прадукцыйнасці працы. Каваль тав. Матвойчык 31 студзеня ўстанавіў новы рэкорд. Добра падрыхтаваўшы рабочае месца, загатовіўшы матэрыялы і інструменты, ён, працуючы на трох горнах, выканаў дзённую норму на 1018 процантаў. Комсамольска - маладзёжная змена пад кіраўніцтвам тав. Гарошка не гледзячы на вялікія марозы, у студзені не мела ніводной затрымкі поезда. Змена адрамантавала 15 вагонаў без адцэпкі ад паяздоў.

Падводзячы вынікі працы за студзень, калектыў вагонарамонтнага пункта абавязаўся выканаць месячнае заданне па сярэдняму рамонту вагонаў на 125 процантаў.

ДОМ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ ДАПАМАГАЕ АГІТАТАРАМ

Вілейка. Вілейскі абласны Дом партыйнай асветы аказвае вялікую дапамогу агітатарам у іх рабоце. У Доме арганізавана выстаўка літаратуры, прысвечаная выбарчай кампаніі. Тут ёсць брашуры М. І. Калініна — «Што дала Совецкая ўлада працоўным», І. В. Сталіна — «Прамова на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы» і іншая літаратура.

Агітатары штодзённа атрымліваюць індывідуальную кансультацыю па ўсіх пытаннях выбарчай кампаніі, праводзяцца групавыя кансультацыі, арганізуюцца лекцыі.

Колькасць наведвальнікаў Дома партыйнай асветы ў апошнія дні значна павялічылася.

ВЫКОНВАЮЦЬ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

Бабруйск. (БЕЛТА). Калектывы перадавых цэхаў, брыгад і прадпрыемстваў Бабруйска паспяхова выконваюць абавязацельствы па датэрміноваму заканчэнню вытворчых планаў. Калектыў мэблевай фабрыкі імені Халтурына в першых дзён новага гаспадарчага года дабіваецца вытворчых поспехаў. План штодзённа перавыконваецца. Перадавое месца займае цэх па выпуску сталоў, якім кіруе комуніст тав. Пеўзнер. Калектыў цэха датэрмінова выканаў месячнае заданне. Лепшыя стаханаўцы - фугаўшчыкі т.т. Жэўжык і Рудзенкоў выконваюць норму на 200 — 230 процантаў.

НА ВЯЛІКІХ ХУТКАСЦЯХ

БАРАНАВІЧЫ. З кожным днём на Брэст-Літоўскай чыгунцы ўсё шырэй унядраюцца стаханаўска-крываносаўскія метады. Разгортваецца спаборніцтва па ваджэнню паяздоў цяжкай вагі.

Не гледзячы на моцныя морозы і снежныя заносы машыністы паказваюць высокія ўзоры. Машыністы дэпо Брэст Ясінскі і Пархамчук днямі правялі цяжкавагавыя паязды з правышэннем тэхнічнай хуткасці на 5 кілометраў. Машыніст Юльскі, які нядаўна стаў працаваць на паравозе, 18 студзеня правёў зборны поезд на ўчастку Лунінец-Жабенка за 10 гадзін 40 мінут, замест звычайных 14-15 гадзін. (БЕЛТА).



На здымку: Машыніст паравоза ЭГ № 160 І. С. Сіманенка і яго памочнік Б. А. Акацэвіч — чыгуначнікі крываносаўцы дэпо Жлобін - Паўночны. (Фотохроніка Белта)

НОВЫЯ ФАСОНЫ ШВЕЙНЫХ ВЫРАБАЎ

Магілёў. На магілёўскай швейнай фабрыцы імені Валадарскага ў студзені асвоена 15 новых фасонаў швейных вырабаў да вясенне - летняга сезона. Сярод іх жаночыя папярова - баваўняныя і шэрсцяныя плацці, блузкі. З дзіцячага асартымента выпушчан новы фасон шэрсцяных плаццяў.

У першым квартале будзе выпушчана 50 новых фасонаў, а за ўвесь год—120 фасонаў швейных вырабаў.

УПАРАДКАВАННЕ КАЛГАСНЫХ РЫНКАЎ

Соўнарком БССР зацвердзіў план будаўніцтва і ўпарадкавання калгасных рынкаў рэспублікі на 1940 г. На гэту мэту асігнавана 2.768 тыс. рублёў. 38,300 квадратных метраў рыначнай плошчы пакрыецца асфальтам. На Камароўскім рынку ў Мінску будуць пабудаваны вадаправод і каналізацыя. На калгасных рынках адкрываюцца 6 новых чайных, 53 ларкі для калгаснага гандлю. 16 мясакантрольных і 15 малакокантрольных пунктаў.

СПЛАЎНЫЯ КАНТОРЫ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР

Для лепшай арганізацыі сплаўных работ на рэках заходніх абласцей БССР, у Гродна, Пінску і Вілейцы арганізуюцца сплаўныя канторы.

Вілейская сплаўкантора будзе праводзіць сплаў драўніны па раце Віліі з яе прытокамі і па нізоўю ракі Заходняя Дзвіна.

У Пінску арганізуецца Верхня-Прыпяцкая сплаўкантора. Яна будзе займацца сплавам драўніны па вярхоўю ракі Прыпяць і яе прытоках. Арганізацыя сплава драўніны па басейну ракі Нёман ускладвена на Нёманскую (г. Гродна) сплаўную кантору. (БЕЛТА).

КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЕ



У вёсцы Бацюты, Беластоцкага раёна, створана камсамольская арганізацыя. Камсамольцы і моладзь актыўна рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.
На здымку: група камсамольцаў і моладзі вёскі Бацюты вывучае выбарчы закон.

ЛЕПШАЯ РАБОЧАЯ МОЛАДЗЬ УСТУПАЕ Ў КОМСАМОЛ

Асабліва хваляваліся сёння Аня, Сяргей і Моўша. Гэта было радаснае перажыванне трох маладых рабочых, якія падалі заявы аб прыёме ў комсамол.

Больш 100 маладых рабочых - тэкстыльшчыкаў прышлі ў рабочы клуб на адкрыты комсамольскі сход пярвічнай арганізацыі першага тэкстыльнага камбіната. Комсорг Бабакова Соня зачытвае заяву маладога ткача Мілера Моўшы. Прысутныя ўважліва слухаюць яго аўтабіяграфію. Мілер — сын цырульніка. Матка яго — старая ткачыха. Моўша ужо шосты год працуе на тэкстыльнай фабрыцы. Яго добра ведаюць рабочыя, якія ў першыя дні совецкай улады выбіраюць яго старшынёй кантрольнай камісіі. Ён актыўна ўдзельнічаў у выбарах Народнага Сабрання, з'яўляючыся агітатарам на 6 выбарчым участку. Мілер адзін з першых на камбінаце перайшоў на абслугоўванне двух ткацкіх станкоў, ён паказвае прыклад у рабоце, даючы па 82.000 удараў у дзень.

У сваёй заяве Мілер піша: «Жадаю быць актыўным будаўніком соцыялізма, верным памочнікам комуністычнай партыі».

Уся сям'я Ані Сіскевіч — тэкстыльшчыкі. Старэйшая сястра яе вылучана дырэктарам ваталіннай фабрыкі, малодшая працуе ткачыхай на гэтым-жа камбінаце. Аня — прыкладная работніца, прымае актыўны ўдзел у жыцці камбіната. Яна член рэвізійнай і культурнай камісій.

— Тав. Сіскевіч, — гаворыць ткачыха Занер, — энергічная, актыўная работніца. У яе нам патрэбна вучыцца ва ўсіх адносінах.

— «Сяргея Радзішэўскага, — заяўляе работніца Беразіна, — я ведаю даўно. Ён сын рабочага. З першага дня прыходу Чырвонай Арміі Сяргей энергічна ўзяўся за аднаўленне разбуранай фабрыкі. Ён многаму дапамог у наладжванні нармальнай работы на камбінаце. Яго, як прыкладнага, лепшага ткача дырэкцыя камбіната вылучыла на работу загадчыкам склада.

Усе тры маладыя рабочыя заслужана атрымалі пачэснае званне членаў Ленінска-Сталінскага комсамола.

* * *

На высокім палітычным узроўні прайшоў комсамольскі сход, на якім прымалі ў комсамол. Сур'ёзна, абдумана і па-дзеласвому комсамольцы падышлі да разгляду заяў. Прысутная моладзь актыўна ўдзельнічала ў гэтым сходзе, задавала рад пытанняў, выступала з грунтоўнай характарыстыкай даных таварышоў.

На сёнешні дзень пярвічная комсамольская арганізацыя налічвае 10 комсамольцаў. Рыхтуюцца да уступлення ў комсамол яшчэ 5 маладых рабочых. На гэтым камбінаце ёсць многа прыкладных, энергічных і ініцыятыўных маладых рабочых, якія дастойны быць у радах Ленінска—Сталінскага комсамола.

Зараз комсамольская арганізацыя камбіната ўключылася ў соцспаборніцтва імені Трэцяй Пяцігодкі. З новымі вытворчымі дасягненнямі комсамольцы і моладзь камбіната абавязаліся сустрэць знамянальную дату — дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

М. Шахновіч.

Лекцыя аб заваёве Арктыкі

Днямі ў памяшканні Дома Чырвонай Арміі адбылася лекцыя для комсамольцаў горада на тэму: „Асваенне Паўночнага полюса бальшавікамі". Лекцыю прачытаў навуковы работнік Мінскага педагагічнага інстытута імені Горкага тав. Шкляр.

Лектар расказаў прысутным аб той гіганцкай рабоце, якую прарабілі бальшавікі па асваенню паўночнага марскога шляху, які мае велізарнае гаспадарчае значэнне для развіцця багатых паўночных і далёка-ўсходніх абласцей Совецкага Саюза. Ён азнаёміў таксама прысутных з імёнамі выдатных палярных даследчыкаў: Літке, Бярынга, Барэнца, экспедыцыяй Нансена на „Фраме" і інш.

Гаворачы аб экспедыцыі на Паўночны полюс рускага вучонага Георгія Седова, тав. Шкляр паказаў, у якіх цяжкіх умовах прыходзілася гэтаму выдатнаму вучонаму на працягу некалькіх год збіраць падачкі для экспедыцыі ад царскага ўрада. Царскія міністры і чыноўнікі, у руках якіх знаходзіўся лёс экспедыцыі, тварылі розныя перашкоды ў гэтай справе.

Толькі пры совецкай уладзе магчыма сапраўднае навуковае вывучэнне Арктыкі. Совецкі ўрад арганізаваў экспедыцыю папанінцаў на Паўночны полюс. Гэта адважная чацвёрка прарабіла там вялікую работу і з багатымі матэрыяламі звярнулася на радзіму.

Совецкі ледакол „Седов," названы па імені рускага вучонага Георгія Садова, 812 дзён быў у дрэйфе ў арктычных шыротах. За іх дрэйфам з напружанай увагай сачыў увесь совецкі народ. На кожным участку работы яны адчувалі цёплую заботу сваёй радзімы і асабіста таварыша Сталіна.

Пасля лекцыі прысутныя задавалі лектару рад пытанняў аб раслінным і жывотным міры ў паўночных шыротах, аб утварэнні марскіх цячэнняў і інш.

У заключэнне сіламі мастацкай самадзейнасці Мінскага педінстытута быў дан канцэрт.

Я. Чэрнухін.

ВЁСКА РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫБАРАЎ

АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ЛЕПШЫХ СЫНОЎ І ДОЧАК НАРОДА

На усё жыццё застанецца ў нашай памяці дзень 17 верасня 1939 года. У гэты дзень гераічная Чырвоная Армія падала нам брацкую руку дапамогі, вызваліўшы народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад панскага прыгнёту.

Над вызваленай зямлёю узышло сонца шчасця і радасці. Там, дзе яшчэ 4 месяцы назад чуліся толькі енкі прыгнечаных людзей, зараз раздаюцца бадзёрыя, жыццерадасныя песні вызваленага працоўнага народа. У сваіх песнях народ хваліць вялікую партыю бальшавікоў, мудрага і любімага Сталіна. Учарашнія рабы сталі поўнапраўнымі грамадзянамі вялікага Совецкага Саюза.

Прайшло ўсяго 4 месяцы, а якія велізарныя змены адбыліся ў нашым жыцці! Узяць нашу Харашчанскую воласць. У кожнай вёсцы новае жыццё забіла ключом. Да ўстанаўлення совецкай улады ў нашай воласці многа была беззямельных сялян. Совецкая ўлада канфіскавала памешчыцкую зямлю і перадала яе бясплатна сялянам. Бедныя, беззямельныя сяляне, усё сваё жыццё марыўшыя аб зямлі, атрымалі яе. У вёсцы Залесяны 14 гаспадарак не мелі зусім зямлі. Невінскі Осіп, не меўшы зямлі, атрымаў 5 гектараў, Каліноўскі Бранілаў — 6 гектараў, Каліноўская Станіслава — 6 гектараў, Крыштофек Франц — 6 гектараў. Больш 300 гектараў памешчыцкай зямлі раздзелена паміж сялянамі. Лугі і пасбішчы таксама адданы ў карыстанне сялян.

Совецкая ўлада дала нам права на бясплатнае абучэнне ў школах, бясплатнае лячэнне, чаго пры ўладзе капіталістаў мы не мелі. Зараз у нас ёсць два медыцынскія ўрачы, зубны ўрач. Раней жанчыны - рожаніцы не звярталіся за дапамогай да акушэркі, бо трэба было плаціць вялікія грошы, таму яны ішлі да бабак - павітух. Цяпер роды прымае акушэрка.

У валасны камітэт вельмі часта прыходзілі сяляне з просьбай аб адкрыцці хатчытальнь, чырвоных куткоў, бібліятэк. Камітэт пайшоў насустрач жаданням сялян. У вёсках Касцюкі і Бацюты адкрыты хаты-чытальні. У вёсках Зачарляны, Тапілец, Рушчаны адкрыты чырвоныя куткі. Пры хатах - чытальнях і чырвоных кутках ёсць бібліятэкі. У мястэчку Хорашч адкрыт клуб.

У вёсках Рогава, Зачарляны, Канавалы, Бацюты, Баршчэва і Толчы арганізаваны курсы па вывучэнню рускай і беларускай мовы, працуюць гурткі па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

Працоўныя нашай воласці, як і ўвесь народ Заходняй Беларусі, сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дні выбараў з асаблівай радасцю. Радавацца ёсць чаму. Мы ўпершыню будзем выбіраць сапраўдных народных прадстаўнікоў у совецкі парламент на аснове самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі.

Мы зараз разгарнулі дзейсную падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У вёсках створаны дзесяткі гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона.

У часць выбараў сяляне ўзялі на сябе абавязацельства сустрэць дзень выбараў узорнай падрыхтоўкай да першай бальшавіцкай вясны. На сваіх сходах і мітынгах сяляне заяўлялі, што яны ўсе, як адзін, пойдуць на выбарчыя ўчасткі і аддадуць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за актыўных барацьбітоў за вялікую справу Леніна—Сталіна.

А. Сенкевіч.
старшыня валаснога камітэта, дэпутат Народнага Сабрання.

ПРЫСТУПІЛІ ДА СКЛАДАННЯ СПІСКАЎ ВЫБАРШЧЫКАЎ

У Бранскім раёне створана 20 выбарчых участкаў. Вылучана 60 агітатараў з ліку комуністаў і комсамольцаў, 40 агітатараў вылучана з мясцовага актыва. Уся агітацыйна-масавая работа перанесена на выбарчыя участкі. На кожным выбарчым участку створан агітколектыў. Праводзяцца 5-дзённыя курсы агітатараў.

Зараз валасныя камітэты прыступілі да складання спіскаў выбаршчыкаў. Для дапамогі ў складанні спіскаў прыцягнуты перадавы актыў, настаўнікі.

Пытанне падрыхтоўкі да выбараў абмеркавана на раённым партыйным сходзе. Партыйны сход намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па разгортванню масавай работы сярод выбаршчыкаў.

С. Г.

У СЁЛАХ НАШАЙ ОБЛАСЦІ

Насельніцтва сёл і вёсак нашай області з вялікай радасцю рыхтуецца да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

На многалюдных мітынгах і сельскіх сходах сяляне заяўляюць, што яны з радасцю аддадуць свае галасы за лепшых прадстаўнікоў народа.

Выступаючы на сельскім сходзе, прысвечаным пачатку выбараў, селянін вёскі Перасёлкі, Гродненскага раёна, Федар Капецкі расказаў:

— Мы, беларусы, пры польскім урадзе ніколі не чыталі польскай канстытуцыі. Паны хавалі яе ад народа. Сталінская Канстытуцыя агульнадаступна для ўсіх. Аб такой канстытуцыі мы толькі марылі. Зараз мы па гэтай канстытуцыі будзем выбіраць сваіх прадстаўнікоў у вярхоўны орган улады. Мы павінны глыбока і ўсебакова вывучыць Сталінскую Канстытуцыю.

Прапанова сялянін Капецкага прынята і праводзіцца ў жыццё.

Сяляне вёскі Якубоўцы, Бельскага раёна, у часць выбарчай кампаніі арганізавалі чырвоны абоз з хлебам. У цэлым Бельскі раён датэрміново выканаў план продажу хлеба дзяржаве, і зараз сяляне многіх вёсак даюць абяцанне дадаткова прадаць дзяржаве лішкі хлеба.

Выбарчая кампанія падымае палітычную актыўнасць сялян. Так, у вёсцы Казлы, Індурскай воласці, сяляне выпісалі насценную газету, прысвечаную выбарам. Сяляне вёскі Белды рашылі ў часць выбараў узорна падрыхтавацца да вясны і добра правесці сяўбу.

Селянін тав. Кадлубоўскі з мястэчка Граева, выступаючы на сходзе, заклікаў грамадзян быць пільнымі.

— Польскія паны, — сказаў Кадлубоўскі, — стараліся трымаць працоўных у цемнаце, жабрацтве і бескультур'і. Замест школ, клубаў і бальніц будаваліся касцёлы. Паны распальвалі нацыянальную варожасць паміж працоўнымі палякамі, беларусамі і яўрэямі. Астаткі варожых элементаў будуць імкнуцца і зараз агітаваць супроць совецкай улады. Наша задача — дапамагчы совецкай уладзе выявіць гэтых нягоднікаў і ачысціць ад іх совецкую зямлю.

Г. Красаўцаў.

АГІТАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

Крынкі. Больш 100 агітатараў праводзяць гутаркі з сялянамі аб прадстаячых выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Агітатары нясуць словы бальшавіцкай праўды ў масы. Яны расказваюць працоўным аб вялікай Сталінскай Канстытуцыі, аб шчасці народаў совецкай зямлі.

Райком партыі ставіць перад агітатарамі задачу — растлумачыць кожнаму выбаршчыку Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон. У вёскі выехала 20 таварышоў з раённага партыйнага актыва. Гэтыя таварышы арганізавалі ў вёсках 30 гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. У гуртках займаецца больш 1000 сялян.

3 лютага пачалі працаваць курсы агітатараў. На курсах займаецца 60 чалавек. Курсамі агітатараў кіруе сакратар райкома партыі тав. Главіцкі.

Днямі праведзена нарада старшынь валасных камітэтаў, на якой абмеркавана пытанне аб складанні спіскаў выбаршчыкаў. Гэта работа ўжо распачата.

Г. Майскі.



Пры беластоцкім доме партыйнай асветы скончылі работу курсы агітатараў.
На здымку (справа налева): слухачы курсаў — работнік гарадскога аддзела аховы здароўя Б. А. Тыкоцінская, снавальшчык фабрыкі № 29 О. О. Фехнер, рабочы фанернага завода А. К. Казберук і ткач фабрыкі № 15 Ш. Ш. Паразоўскі.

НАВЕСТИ ПОРЯДОК В ЛЕСНОМ ХОЗЯЙСТВЕ В ОЗЕРАХ

Вокруг местечка Озеры, Гродненского района, расположены большие массивы лесов, которые могут сыграть значительную роль в обеспечении топливом Белостокской области. Крестьяне окружающих деревень, в особенности бедняки, понимая большое значение доставки топлива для социалистической промышленности и трудящегося населения города, усердно работают на доставке дров. Возчик Алексей Жук из деревни Ловзы сам провел большую разъяснительную работу среди крестьян своей деревни и убедил их в большом значении доставки дров для своего социалистического государства.

Рабочие-лесорубы, несмотря на целый ряд трудностей, работают честно, сознавая великое значение своей работы. Так, например, лесорубы Хлебинский и Сенкевич из бригады бракера Калецкого заготовили за 3 дня 38 кубометров ольхи, что значительно перевышает норму.

Но имеется целый ряд причин, мешающих успешной заготовке и доставке дров. До сих пор не развернулась еще работа профсоюза. Никто рабочим не разъясняет систему расценок. Не указывает им, как надо лучше организовать работу, как применять методы социалистического соревнования, чтобы поднять производительность труда. Не ведется почти никакая разъяснительно-политическая работа в связи с выборами в Верховные Советы.

В леспромхозе и в лесхозе в Озерах в большинстве остались старые кадры, которые приучили применять методы кнута и насилия по отношению к рабочим и крестьянам. Так, например, начальник участка лесхоза в Озерах Долинский был и при польских властях начальником лесничества и относился к трудящимся очень безобразно. Все трудящиеся в Озерах прекрасно помнят, как господин Долинский угрожал „расстрелом всех жидов и коммунистов". Но пока что он продолжает оставаться на работе.

На участке лесхоза в Озерах работал еще бывший заведующий панским имением Задубе — Тылевич, известный как эксплоататор местных крестьян. Гродненский леспромхоз снял его с работы в Озерах, но поставил его на более ответственную работу в конторе леспромхоза в г. Гродно. Друг Долинского и Тылевича лесник Миленкевич агитирует рабочих лесорубов, „чтобы они не трудились усердно для советской власти".

Совершенно естественно, что такие люди не могут и не хотят обеспечить заготовки и доставки дров для социалистического государства и его промышленности. В леспромхозе Озеры царит беспорядок. Бригада лесорубов мастера Гольдштейна 3 дня ходила на указанный леспромхозом участок, а там им лесник по распоряжению начальника Долинского не разрешал рубить дрова. 26 января лесники заставили 8 возчиков-крестьян ехать за 40 километров, пока они получили дрова. Того же дня другая партия возчиков должна была разыскивать лесников на 12 километров от условленного места и т. п.

Пора, чтобы Заготлес взялся за очистку леспромхоза Озеры от враждебных элементов, за коренное улучшение всей работы. Пора профсоюзным организациям развернуть среди лесорубов широкую массовую работу.

С. Л. Венгеров,
сотрудник облтопа.

МНОГАСТАНОЧНІКІ КАМБІНАТА № 1

Калектыў рабочых, ІТР і служачых першага тэкстыльнага камбіната ганарыцца сваімі лепшымі людзьмі многастаночнікамі. Выдатны рух многастаночнікаў зарадзіўся на камбінаце па ініцыятыве двухстаночніка Медлінскага і падхоплен на другіх прадпрыемствах.

На аснове разгортвання соцспаборніцтва калектыў камбіната дабіўся перавыканання студзеньскага плана. План па прадзільнаму цэху выканан на 107%, а па ткацкаму — на 130. У гэтым вялікая заслуга двухстаночнікаў, якіх на камбінаце ўжо звыш 50.

Днямі адбылася нарада двухстаночнікаў. Чырвоны куток запоўнілі рабочыя, якія першымі ў Беластоку перайшлі на абслугоўванне двух і больш станкоў. Побач з першым двухстаночнікам Медлінскім, камсамольцам Мілерам, першай жанчынай двухстаночніцай Рэчыцкай—старыя рабочыя, галавы якіх пакрыты сівізной, ткачы з 40-гадовым стажам тт. Невінскі, Вебер і др.

З дакладам аб рабоце камбіната ў студзені, яго першых перамогах, аб выдатнай рабоце многастаночнікаў выступіў дырэктар камбіната тав. Вальфсон.

— Наш калектыў,—сказаў ён,—працуе дружна, з уздымам. Рабочы адчуў, што ён больш не працуе на фабрыканта і эксплаататара: ён сам гаспадар вытворчасці. Прадукцыйнасць працы вырасла на 30—40%.

Кожны дзень у дырэкцыю камбіната паступаюць заявы аб пераводзе на двухстаночную работу. Рад таварышоў ужо не абмяжоўваюцца і двумя станкамі—пераходзяць на 3 і 4-станочную работу. Першым на камбінаце перайшоў на абслугоўванне 4- станкоў малады ткач тав. Ліўшыц. Рух многастаночнікаў з ткацкага пераходзіць і ў другія цэхі. Рад шпулярак патрабуюць перавода іх на абслугоўванне 24 шпуль замест 12.

Многастаночнікі дабіліся выдатных поспехаў. Працуючы на адным станку, ткач тав. Лісатурскі даваў па 38 тысяч удараў у змену,—зараз на двух станках ён дае ўжо 76—78 тысяч ударaў. Тав. Рэчыцкая давала раней 30 тысяч ударaў—зараз 66 тысяч. Вырасла заработная плата. Ткач Меламед раней выпрацоўваў па 18 рублёў у дзень—зараз у сярэднім па 22 рублі. Аднак у сістэме зарплаты адчуваецца путаніца. Яшчэ многа выпадкаў, калі рабочы, працуючы на адным станку, атрымоўвае больш чым двухстаночнік.

Яркімі былі выступленні многастаночнікаў, якія расказалі аб сваёй рабоце, аб росце вытворчасці працы. Выступаўшыя таварышы патрабавалі ад дырэкцыі камбіната ўдзяляць ім больш увагі, стварыць умовы для бесперабойнай работы двухстаночнікаў.

— Калі я адным з першых пераходзіў працаваць на 2 станкі,—сказаў тав. Ліўшыц,—многія рабочыя смяяліся, гаварылі што з гэтага нічога не выйдзе. Радасна бачыць гэтых рабочых зараз тут на нарадзе—яны самі сталі двухстаночнікамі. Я зараз перайшоў на абслугоўванне 4-х станкоў, даю за змену 123—125 тысяч ударaў. У бліжэйшы час я спадзяюся яшчэ больш узняць прадукцыйнасць працы.

Аднак, у маёй рабоце ёсць яшчэ многа цяжкасцей, многа часу ўходзіць на падсобную работу, на падноску матэрыялу, змазку машын. Мала ўвагі ўдзяляе нам майстар. Зараз ён заняты і будаўніцтвам падлогі, і арганізацыйнай працай, але толькі не нашай работай. Патрэбна ў бліжэйшы час ліквідаваць усе гэтыя недахопы, і тады мы зможам паказаць яшчэ лепшыя ўзоры работы.

— Я сяджу тут на нарадзе як у сне,—пачаў сваё выступленне ткач з 42-гадовым вытворчым стажам тав. Невінскі. Зусім нядаўна мы былі лішнімі людзьмі, нас выкідалі на вуліцу, мы былі нічым. Звяршылася цуда. З намі, рабочымі, лічацца, раяцца, як лепш пабудаваць работу на нашай-жа фабрыцы!


Я стары ткач, працую зараз на двух станках. Разам са мною на 2 станках працуе і мой сын. Мы з ім спаборнічаем на лепшую работу. У аддзяленні, дзе я працую, 28 станкоў, раней тут працавала 28 чалавек на адной змене, зараз гэтыя людзі абслугоўваюць усе станкі ўжо на 2-х зменах. Мы выпускаем прадукцыю ў два разы больш чым раней. Гэта новыя сотні і тысячы метраў тканін, якія ідуць на карысць народа.

Аб стварэнні маладзёжнай брыгады двухстаночнікаў гаварыў у сваім выступленні таварыш Мілер, нядаўна прыняты ў Ленінска-Сталінскі камсамол.

З прамовай на нарадзе выступіў сакратар Беластоцкага гаркома партыі тав. Гершман. Ён заклікаў двухстаночнікаў яшчэ лепш працаваць на карысць радзімы, дзейсна ўдзельнічаць у правядзенні выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Многастаночнікі двух ткацкіх цэхаў камбіната заключылі між сабою дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва, на ўзняцце вытворчасці працы, на лепшую работу.

З. Розін.



На снимке (слева направо): тт. **Нышт, Зильберштейн** и **Шейнога** — двухстаночники белостокского текстильного комбината № 2. Фото Сапир.

ДОБЬЕМСЯ НОВОГО ПОД'ЕМА ПРОИЗВОДИТЕЛЬНОСТИ ТРУДА

На нашем текстильном комбинате № 2 уже 9 ткачей перешли на обслуживание 2-х станков.

Нам пришлось преодолеть некоторые трудности, но нас воодушевил пример стахановцев Советского Союза и мы со всей решительностью взялись за дело в полном сознании того, что мы работаем не на фабриканта, а на самих себя.

Результаты получаются не плохие. Так, например, тов. Шейнога достиг в течение последних 10 дней 760 тысяч ударов при работе на 2-х станках, что означает в среднем 76 тысяч ударов в день. Притом качество продукции у тов. Шейнога не хуже чем при работе на одном станке, а длина концов не превышает никогда 25 метров.

Это результат внимательного и аккуратного отношения к работе и станкам. Мы ежедневно с утра чистим машины и смазываем их. Мы правильно и рационально наполняем челноки, что дает нам возможность спокойно наблюдать за основой и на ходу связать нитки, когда они рвутся.

Свой опыт мы стараемся передать другим. Использовываем каждый свободный момент, чтобы раз'яснить остальным товарищам значение работы на 2-х станках. Таким образом нам удалось убедить еще 5 товарищей, которые подали заявления о своем желании перейти на работу на 2-х станках. Всего таких заявлений на нашем комбинате поступило 30.

Большое значение для успешной многостаночной работы имеет помощь мастера. Мы убеждены в том, что наш мастер тов. Больчик, который нас поощрял к переходу на 2 станка, и в дальнейшем будет особенно прислушиваться к ходу машин у двухстаночников, помогая нам исправлять на ходу недостатки.

Выборы в Верховные Советы СССР и БССР имеют для нас, как и для всех 13 миллионов новых советских граждан, огромное значение. Мы отдадим все силы для того, чтобы в связи с выборами в Верховные Советы добиться дальнейшего повышения производительности труда.

Двухстаночники:

С. Зильберштейн.

Вл. Шейнога.

ПЕРЕПИСКА МОСКОВСКИХ И БЕЛОСТОКСКИХ ТЕКСТИЛЬЩИКОВ

2-го февраля рабочие и работницы текстильного комбината № 2 в Белостоке получили от коллектива Московской Трехгорной Мануфактуры имени Дзержинского письмо. Трехгорцы рассказывают в своем письме о достижениях в работе и призывают белостокских текстильщиков образцово провести избирательную кампанию.

Вечером того же дня коллектив белостокского комбината единогласно принял ответное письмо.

— Мы обещаем,—пишут белосточане, — работать хорошо, развивать стахановское движение. Январский план по пряже мы выполнили на 120 проц., по ткацким цехам—на 110 проц. Мы обещаем в течение 1-го квартала иметь на своем комбинате 500 стахановцев. Будем активно участвовать в избирательной кампании. Производственные планы будем выполнять досрочно, давая при этом высококачественную продукцию.

Г. К.

ВЫСТАЎКА РАБОТ МАСТАКОЎ БЕЛАСТОКА І МІНСКА

У дзяржаўнай карціннай галерэі БССР адкрыта выстаўка работ мастакоў-графікаў Беластока.

Перш за ўсё хочацца адзначыць работы Ю. А. Краеўскага. Гэта тонкі і соцыяльна-востры мастак. Яго работы галоўным чынам прысвечаны сялянскаму жыццю былой Польшчы. Соцыяльны прыгнёт, надзвычайная беднасць, сваволле памешчыкаў і абуджаючыся да барацьбы беларускі народ — такія тэмы работ Ю. А. Краеўскага.

Асабліва выразныя рысункі: „Песня" і „Сяляне б'юць прыказчыка". У першым мы бачым ідучых з поля беларускіх сялянак, якія спяваюць песню. У гэтым рысунку мастак Краеўскі вельмі ўдала перадаў нарастаючае ў сэрцах сялян абурэнне і гнеў супроць паноў. У другім рысунку паказаны паўстаўшыя сяляне, якія віламі б'юць панскага прыказчыка.

Мастак І. Е. Кжэчаноўскі прадстаўлен хоць і незначнай колькасцю работ, але работы гэтыя сведчаць аб значным майстэрстве мастака. Адзначым літаграфію „Жанчына ў сутарэнні", афорт „Партрэт старой" і афорт „У прытулку для старых".

Цікавыя работы мастака З. Тыбер. Асабліва вылучаюцца соцыяльныя партрэты: „Партрэт яўрэя", „Галава рабочага" і афорты на жанравую тэму—„Шавец" і „Разносчык вады". Работы гэтыя сведчаць аб вострай назіральнасці мастака, аб яго ўменні адабраць галоўнае і перадаць яго на рысунку.

Вылучаецца на выстаўцы літаграфія мастака Е. М. Малярэвіча „Беспрытульныя Польшчы". Заслугоўваюць быць адзначанымі работы Н. Г. Ляндау: афорт „Мангольская дзяўчына", гравюра на дрэве „Архітэктура Прымор'я".

Большасць прадстаўленых на выстаўцы работ прасякнуты духам дэмакратызма. Жывучы і працуючы ў цяжкіх умовах соцыяльнага прыгнёту былой Польшчы, лепшыя мастакі знаходзілі ў сабе грамадзянскую мужнасць тварыць для народа.

А. Далін.

УСТУПНЫЯ ІСПЫТЫ Ў МУЗЫКАЛЬНАЙ ШКОЛЕ

Упершыню ў Беластоку адкрываецца дзяржаўная музыкальная школа. Да гэтага часу ў Беластоку былі тры прыватныя музыкальныя школы, вучоба ў якіх стаяла на нізкім узроўні. Вучні адной з гэтых школ пасля 4-х год вучобы не скончылі нават „школы Бейера" — элементарнага алфавіта музыкі.

Новаадкрываемая школа дасць вучням магчымасць спецыялізавацца на розных інструментах. Яна мае 4 спецыяльныя аддзяленні: раяля, скрыпкі, віяланчэлі і народных інструментаў. Кожнае аддзяленне падзяляецца на курсы. У школе будуць выкладаць 14 кваліфікаваных настаўнікаў музыкі. Сярод іх старыя педагогі т.т. Петлін, Клінкаўштэйн, скрыпач Дактаровіч і іншыя. Завучам школы з'яўляецца тав. Сабурова, якая скончыла Ленінградскую кансерваторыю, дырэктарам — скрыпач Каваленак, які скончыў кансерваторыю ў Мінску.

1 лютага ў памяшканні школы пачаліся ўступныя іспыты. На працягу першых трох дзён іспыты здавала звыш 187 дзяцей. Школай будзе прынята 200 дзяцей. Іх узрост — ад 9 да 12 год. Многія з іх здольныя да музыкі, але не мелі да гэтага часу магчымасці вучыцца.

За раяль садзіцца 13-гадовы Рычард Бакст. Ён іграе на раялі з 7 год. З пачуццём і незвычайнай у гэтым узросце тэхнікай выконвае ён творы Баха, Брамса, Мендэльсона, і нават свае ўласныя кампазіцыі—варыяцыі і эцюды.

У пакой уваходзяць браты Пётр і Іван Кардаш з вёскі Мялешкі. Яны ўжо дарослыя, маюць па 18 і 20 год. Без школы і мастацкага кіраўніцтва вывучыліся яны іграць на скрыпцы. Абодва маюць слух і музыкальныя здольнасці. Цяпер яны ўпершыню атрымаюць магчымасць развіцця іх здольнасцей пад кіраўніцтвам педагогаў.

Па чарзе ўваходзяць дзеці ў экзаменацыйны пакой. Усе хочуць вучыцца іграць, усе яны ўпэўнены, што 10 лютага, калі будуць вядомы рэзультаты іспытаў, прыдуць у гэту школу ўжо не як госці, а як вучні.

Л. Р.

Герои боев с белофиннами

Лейтенант Арбузов

За дверью кто-то громким голосом сказал:

— Здравствуйте, товарищи! — И сразу в соседней комнате веселое оживление сменило деловитую тишину.

В общем шуме нельзя было разобрать слов, но легко было догадаться, что идет шутливая перепалка со вновь прибывшим товарищем. Смеялись все. Однако выделялся чей-то такой заразительный и жизнерадостный смех, что даже мы не могли не улыбнуться, хотя и не слышали, о чем идет разговор.

Он вошел в нашу комнату стремительно — невысокого роста, плотный, крепко слаженный человек, — и, как будто отдавая рапорт, проговорил:

— Лейтенант Арбузов!

Вся его фигура дышала здоровьем, энергией, весельем.

— Отчаянный человек! — сказал политрук Крохин, тепло улыбаясь.

— И вовсе не отчаянный, — немедленно ответил Арбузов, очевидно, продолжая недавнюю беседу с политруком. — А если я всегда иду впереди бойцов и опасности не боюсь, так это мне по штату положено. Не так ли?

Он уже не смеялся. Резко очерченные губы были плотно сжаты. Но глаза все так же светились, и видно было, что в любую минуту он готов осыпать всех ураганным огнем смеха, шуток и ядреных народных пословиц.

Вот таким он был в быту. Таким же был и в боях...

* * *

Темной, непроглядной ночью полз по снегу Георгий Николаевич Арбузов, лейтенант-пограничник. Он вел небольшой отряд на помощь бойцам, лежавшим уже больше семи часов где-то около моста.

С обеих сторон дороги велась непрерывная стрельба, и нельзя было разобрать, где свои и где враг, потому что белофинны стреляли только из винтовок. Если бы палили автоматы, сразу можно было бы определить по звуку местонахождение противника. Но автоматы молчали...

Приказав отряду залечь, лейтенант Арбузов с двумя бойцами пополз вперед. Приблизился на расстояние не более ста метров от места перестрелки.

— Кто тут стреляет?—громким голосом крикнул лейтенант.

С правой стороны немедленно откликнулись:

— Свои!

Все стало ясным. Бросив гранату в левую сторону от дороги, Арбузов переполз к своим, и через короткое время весь его отряд был здесь.

Граната наделала шуму. Если раньше враги стреляли только из винтовок, то теперь заговорили пулеметы, автоматы и какая-то пушка.

— Финский броневик... — определил про себя лейтенант.

Шюцкоровские пули ложились так густо, что было немыслимо даже голову приподнять. В редкие минуты перерывов между белофинскими залпами наши бойцы дружно обстреливали замеченные огневые гнезда противника, точно выполняя приказ Арбузова:

— Не видишь — не стреляй. Увидишь — пали!

До самого утра неприятель бесцельно тратил патроны, поливая огнем хорошо укрытых и замаскированных красноармейцев.

Утром услышал лейтенант орудийные выстрелы. Осторожно выползши из укрытия, он подобрался к дороге и увидел нашу батарею.

— Стреляй левее! — крикнул Арбузов командиру батареи. — Бей сильней, а я начну атаку. Бойцы! Приготовить гранаты! Крепче насадить штыки! Слушай мою команду!...

Как огненный дождь, грянула на головы белофиннов советская шрапнель.

— Наддай жару! — кричал Арбузов, и веселым грохотом отвечали ему наши орудия.

Наступил момент атаки. Арбузов поднялся:

— Товарищи! Вперед! За Сталина! Ур-а-а!

Дружным рывком поднялись пограничники и красноармейцы. Длинной цепью бежали они за своим командиром, и громовое «ура» раскатывалось по лесу.

Сразу были смяты вражеские цепи. Захлебнулся и замолк шюцкоровский пулемет. Граната Арбузова разнесла на куски белофинских пулеметчиков. Но не пропадать же такому добру, как пулемет! Лейтенант резким движением повернул станину, и длинная очередь стала догонять и добивать финскими пулями бегущих в панике шюцкоровцев.

Трофеи были значительными. Веселыми шутками встречал Арбузов красноармейцев, принесших ему три станковых пулемета, много вражеских автоматов и винтовок. Бойцы притащили сорокапятимиллиметровую пушку и ящики с патронами. Эти патроны заняли пол грузовика. Вдали маячил захваченный белофинский броневичок. Не лишней оказалась и полевая сумка убитого офицера, в которой нашлись карта с точным обозначением местности и кое-какие важные документы...

Но не закончились на этом боевые операции дня. Нужно было двинуться на следующий километр дороги, чтобы уничтожить белофинскую засаду.

Быстро были закреплены снятые раньше лыжи. Глубоким обходным маршем двинулся отряд в лес. Бесшумно скользили бойцы. Все ближе и ближе слышалась стрельба. Отряд подошел к линии вражеских укреплений и развернулся для атаки. Где-то, в нескольких метрах впереди, стучали белофинские автоматы.

И снова крикнул Арбузов, подняв гранату:

— За родину! Ура!

Паника в рядах противника была невообразимой. Бросая все, враги бросились бежать, но всюду встречали они пулю в упор и острие четырехгранного советского штыка. Белофинны, попавшие в мешок, были уничтожены.

Но отряд неприятеля, сидевший слева от окруженной засады, сумел бежать.

И Арбузов, успевший уже убить гранатой вражеского пулеметчика и какого-то «дятла», спрыгнувшего с дерева прямо под ноги лейтенанту, приказал преследовать противника.

Мгновенно все снова стали на лыжи. Итти пришлось недолго. Шюцкоровский отряд, засевший в ранее приготовленных окопах, засыпал бойцов пулями.

Тогда Арбузов, приказав части бойцов итти в обход, подобрался к окопам неприятеля. Когда прошло достаточно времени для того, чтобы товарищи успели зайти в тыл врагу, лейтенант пустил короткую очередь из только-что захваченного им финского автомата.

Шюцкоровцы решили, что они ошиблись, приняв идущих людей за врагов. Белофинны тут же прекратили стрельбу. И тогда со всех сторон ринулись на них советские бойцы. Ошалевшие от неожиданности шюцкоровцы даже не сумели выстрелить.

Обратно бойцы отряда двинулись с трофейным оружием в руках. В лощине около первой засады увидели гору вражеских трупов. Их было не меньше шестидесяти, не считая тех, которые лежали вокруг.

Дорога была свободна.

Придя на заставу, весело рассказывали красноармейцы своим товарищам эпизоды из только-что кончившейся боевой операции.

И громче всех смеялся лейтенант Арбузов, готовый в любую минуту не только громить врага, но и осыпать друзей градом веселых шуток и ядреных народных поговорок.

А. Безыменский.

Напечатано в ежедневной красноармейской газете Н-ского соединения.

ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА АНГЛІІ І ФРАНЦЫІ Ў СУВЯЗІ З ВАЙНОЙ

Пяць месяцаў вайны англа-французскага блока супроць Германіі паказалі, што ўмовы, у якіх разгортваецца другая імперыялістычная вайна, рэзка адрозніваюцца ад тых умоў, у якіх працякала сусветная вайна 1914 — 1918 гг. Умацаванні: лінія „Мажыно" — з французскага і лінія „Зігфрыда" — з германскага боку — робяць больш складанымі ваенныя аперацыі на сушы. Ніводная краіна не рызыкуе панесці велізарныя ахвяры для прамога прарыву гэтых ліній. Пагэтаму вайна зараз ідзе, галоўным чынам, па лініі магчыма большага паслаблення эканомікі праціўніка. Аб'яўленая англійскім урадам блакада германскага экспарта, паветраная і падводная вайна Германіі супроць гандлёвага флота Англіі і Францыі, шалёны націск англа французскага блока на нейтральныя краіны з мэтай прымусіць іх уключыцца ў эканамічную блакаду Германіі—усё гэта гаворыць аб тым, што ідзе жорсткая вайна за эканамічнае знясіленне праціўніка.

Трэба адзначыць, што эканамічнае становішча англа-французскага блока ў параўнанні з Германіяй выглядае значна горшым, чым у вайну 1914—1918 гг. Германія значна раней, чым яе праціўнікі, пачала прыстасоўваць сваю эканоміку да патрэб вайны і стварыла больш салідныя, чым раней, запасы сыравіны і ваенных матэрыялаў. Акрамя таго, Германія ўступіла ў вайну эканамічна не ізаліраванай: яна мае магчымасць прадаўжаць знешні гандаль з Скандынаўскімі краінамі, з СССР і Балканамі. У той-жа час Англія, будучы аддзелена ад сваіх уладанняў акіянамі і марамі, ва ўмовах марской вайны можа быць лёгка падвержана блакадзе.

Ні адна вялікая дзяржава ніколі не была ў такой залежнасці ад знешняга гандлю, як Англія. 75 працантаў неабходнага харчавання Англія вымушана ўвозіць з дамініёнаў, калоній і іншых краін.

З важнейшых відаў ваеннай сыравіны Англія забяспечана толькі вуглем і то яго вытворчасць у 1938 годзе была на 18 працантаў ніжэй, чым у 1913 годзе.

Нафты ў Англіі зусім няма, і яна яе цалкам увозіць з сваіх калоній.

Нарэшце, сталі Англія ў 1939 годзе выплавіла 10,5 мільёна тон супроць 25 мільёнаў тон у Германіі (з Чэхаславакіяй). Бавоўну, табак воўну, каляровыя металы і г.д. Англіі таксама прыходзіцца падвозіць з сваіх калоній і даміёнаў морам.

Вайна ў самым пачатку аказала велізарны ўплыў на знешні гандаль Англіі. Да 15 студзеня выведзена з строю 138 англійскіх параходаў агульным водазмяшчэннем у 503 тысячы тон. Знешні гандаль Англіі ўжо за першыя тры месяцы вайны знізіўся ў параўнанні з тымі-ж месяцамі (верасень—лістапад) 1938 года па ўвозу на 16 працантаў і па вывазу—на 32 працанты. У краіне ўжо адчуваецца недахоп мяса, тлушчаў, цукру — на гэтыя прадукты ўведзена картачная сістэма. Цэны на прадукты харчавання ўзняліся: на цукар на 47 працантаў, на рыбу — на 29 працантаў, на масла — 14 працантаў і г. д.

Становішча з харчаваннем ва Францыі больш добрае, чым у Англіі. Усё-ж і яна вымушана пэўную частку сваёй патрэбнасці задавальняць за кошт увозу з калоній. Горш абстаіць справа з стратэгічнай сыравінай. Францыя штогод павінна ўвозіць з-за граніцы на 10 мільярдаў франкаў гаручага, на 9 мільярдаў франкаў сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці, на 1,4 мільярда хімічных прадуктаў, 40 працантаў патрэбнай колькасці жалезнай руды. Далейшае разгортванне вайны патрабуе большай колькасці ваеннай сыравіны і, безумоўна, паставіць эканоміку Францыі ў больш цяжкае становішча.

Усё гэта гаворыць за тое, што эканамічнае становішча англа-французскага агрэсіўнага блока не такое бліскучае, як гэта хоча паказаць буржуазны друк гэтых краін.

На западном фронте

Париж, 7 февраля. (ТАСС). В официальном коммюнике о военных действиях, опубликованном вчера вечером в Париже, говорится: «В районе западнее Саара отмечались местные действия патрулей».

В утреннем сообщении сказано, что «на фронте не произошло ничего нового».

ВЫНІКІ МІЖАБЛАСНОЙ НАРАДЫ ДЭРМАТА-ВЕНЕРОЛАГАЎ

Закончылася міжабласная нарада дэрмата-венеролагаў заходніх абласцей БССР.

Для медыцынскіх работнікаў яна з'явілася важнай падзеяй: упершыню медыцынскія работнікі былой Польшчы атрымалі магчымасць прааналізаваць прычыны распаўсюджання венерычных хвароб і прастытуцыі на тэрыторыі капіталістычнай панскай Польшчы, упершыню прадставілася рэальная магчымасць намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе з імі і паставіць з усёй вастрынёй набалеўшыя пытанні

На нарадзе ўдалося выявіць, у якой меры асобныя аблздраўаддзелы заходніх абласцей Беларусі ўключыліся ў гэту адказную работу, якая мае вялікае палітычнае значэнне.

Прысутнасць і актыўны ўдзел у рабоце нарады ўрачоў-акушэраў, генеколагаў, педыятраў, галоўных ўрачоў больніц, паліклінік і амбулаторый, паказалі наяўнасць моцнага касцяка сярод ўрачоў заходніх абласцей Беларусі, якія жадаюць чэсна і актыўна працаваць над аздараўленнем быту працоўных.

У галіне барацьбы з венерычнымі хваробамі за чатыры месяцы існавання савецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі праароблена вялікая работа. Нарада падвяла вынік яе: адкрыта каля двух дзесяткаў спецыяльных лячэбна - прафілактычных устаноў - дыспансераў і стацыянараў. Праводзіцца ізаляцыя ўсіх венерычна хворых у розных перыядах хваробы. Шырока ўкараняецца практыка дыспансерных метадаў работы — прыступлена да энергічнага выяўлення крыніц заразы, да сістэматычнага абследвання членаў сям'і хворых, да дасканалага кантролю за правільным лячэннем хворых.

Пачалася санітарна - асветная работа сярод хворых і арганізаванага насельніцтва.

Замест адзінкавых вольнапрактыкуючых ўрачоў - спецыялістаў каля 50 урачоў вядуць цяпер актыўную арганізаваную барацьбу з венерычнымі хваробамі. Змяніліся метады барацьбы з прастытуцыяй. Мяркуецца адкрыццё спецыяльнага лячэбна-працоўнага прафілакторыя ў г. Беластоку для бяздомных жанчын, хворых венерычнымі хваробамі.

Нарада намеціла дадаткова адкрыць 8 новых стацыянараў у розных пунктах заходніх абласцей БССР.

Нарада прызнала неабходным склікаць на працягу першага квартала 1940 года ўчастковых урачоў для інструктажу па пытанню барацьбы з венерычнымі хваробамі, забяспечыць урачоў медыцынскай метадычнай і санітарна - асветніцкай літаратурай.

Мы ўпэўнены ў тым, што метадамі спаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваючы крытыку і самакрытыку, работнікі венералагічных устаноў з дапамогай кіруючых органаў савецкай улады вырашаць задачу па максімальнаму зніжэнню венерычных захворванняў у заходніх абласцях БССР.

Дракін, Лас.


Выключны матэматычны талент

Днямі ў аблана прышоў грамадзянін Дрэзнер з просьбай паслаць яго 6-гадовага сына Боруха для спецыяльнага абучэння ў Маскву ці Мінск. 6-гадовы хлопчык мае выключныя здольнасці ў вусным лічэнні. На працягу 2—3 мінут ён можа памножыць вусна любы 7 - 9-значны лік на двухзначны. Так, прысутныя прапанавалі юнаму матэматыку памножыць вусна 215 839 769 на 73. Праз дзве мінуты Борух даў правільны адказ.

Цікава сама тэхніка вылічэння. 6 гадовы матэматык спачатку множыць сотні мільёнаў на двузначны лік, потым дзесяткі мільёнаў, адзінкі мільёнаў, сотні тысяч, дзесяткі тысяч і г. д. Рэзультаты гэтых многіх дзеянняў ён памятае і потым вусна складае. Такім чынам, мы маем справу з выключнай матэматычнай памяццю.

Ва ўмовах былой капіталістычнай Польшчы ніхто не праявіў ініцыятывы, каб юнаму матэматыку стварыць умовы для разумнага развіцця яго таленту. Наадварот, яго выкарысталі ў камерцыйных мэтах. Борух выступаў многа разоў на платных вечарах у Варшаве, дзе яму задавалі больш 100 пытанняў.

У Беластоцкім педагагічным інстытуце днямі адбудзецца экспертыза над юным матэматыкам, для чаго запрошаны прафесары. Пасля экспертызы юны матэматык будзе накіраван у Мінск.



В Гродно проходила олимпиада художественной самодеятельности. На снимке: Участницы олимпиады исполняют белорусские народные танцы. (Фотохроника Белга).

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

У КОМПОЗИТОРОВ

Среди композиторов Белостокской областной государственной филармонии наблюдается большой творческий под'ем.

В честь выборов композиторы создают новые музыкальные произведения, посвященные теме братства народов Советского Союза, свободной жизни, великому Сталину.

Композиторы тт. Надель и Бельзацкий написали песни о Сталине, Композитор тов. Каганович написал марш для джаз-оркестра под названием «Дружба народов». Заканчивают новую работу, посвященную выборам, композитор тов. Петерсбургский.

Белостокская областная филармония в период избирательной кампании будет шефствовать над одним из избирательных округов. Кроме того, бригады артистов филармонии будут обслуживать 12 районов области. Сейчас эти бригады готовят концерты по специальным программам.

У ПЕДВУЧЫЛІШЧЫ ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ

Учора ў Беластоцкім педагагічным вучылішчы пачаліся заняткі. З 370 чалавек, падаўшых заявы, вытрымалі прыёмныя іспыты і прыняты 220 вучняў. Створаны 2 падрыхтоўчых групы, 4 першых класы і 2 другіх. Педвучылішча поўнасцю ўкамплектавана выкладчыкамі.

Ва ўсіх класах пачалася вучоба па цвёрдаму раскладу.

Усе вучні забяспечаны інтэрнатам, 70% атрымаюць стыпендыю ў залежнасці ад паспяховасці.

БЕЛАСТОЦКІЯ ШАХМАТЫСТЫ Ў ГОМЕЛІ

4-га лютага з Беластока ў Гомель выехала група шахматыстаў у саставе 7 чалавек. Сярод іх — рабочы шклозавода тав. Лапот, рабочы фанернага завода тав. Данільчук, сакратар гарадскога шахматнага клуба тав. Бракер, гарадскі інспектар па шахматах тав. Клементаноўскі і інш.

6-га лютага пачаліся першыя таварыскія сустрэчы з шахматыстамі Гомеля. Учора рэдакцыя атрымала тэлеграму ад тав. Бракера, у якой гаворыцца:

«З першага дня Беласток атрымаў перамогу з лікам 3:2. Клементаноўскі зрабіў нічыю з майстрам СССР Мачевічам. Беластачанін Кауфман выйграў у Грыгор'ева. Астатнія — нічые. Гомельскія шахматысты прынялі нас гасцінна».

ВОССТАНОВЛЕНИЕ ЗАВОДА

Находящийся в ведении фанерного треста завод № 9 был разрушен во время польско-германской войны.

Завод частично восстановлен. На работы по восстановлению израсходовано 450 тысяч рублей,

В ноябре завод работал в одну смену, в декабре начал работать в две смены, а в январе перешел на 3-сменную работу.

В течение 1940 г. еще 400 тысяч рублей будет израсходовано на окончательное восстановление завода.

Если в декабре завод дал всего 392 кубометра продукции, то в январе продукция завода составляла уже 1.100 кубометров фанеро-продукции.

В течение 1940 г. завод даст 15 тысяч кубометров фанеры.

Сейчас на заводе работает 950 человек.

УСПЕХ НОВОЙ ВОЗДУШНОЙ ЛИНИИ

Новая воздушная линия Москва—Минск—Белосток—Берлин пользуется большим успехом. Число желающих воспользоваться авиационной линией превосходит количество свободных мест в самолете. Идет оборудование гостиницы для пассажиров. Эта гостиница рассчитана на 30 человек.

РАЗВИВАЕТСЯ ОБЩЕСТВЕННОЕ ПИТАНИЕ

В помещении б. ресторана Рубинштейна открылась новая городская столовая. Столовая выдает в день от 400 до 500 обедов.

На первом этаже здания гостиницы № 1 (б. гостиница «Риц») открылось городское кафе.

Кафе работает весь день без перерыва.

СБОР СРЕДСТВ НА ПОСТРОЙКУ ПАМЯТНИКА ГЕРОЯМ КРАСНОЙ АРМИИ

В селах и деревнях Гродненского и соседних районов по инициативе самих крестьян успешно проходит сбор средств на постройку памятника героям Красной Армии, погибшим в боях за г. Гродно при освобождении Западной Белоруссии от польских панов. Уже собрано и переведено в финансовый отдел свыше 35 тысяч рублей. В местечке Волпа собрано 1.400 рублей. Всюду сбор средств продолжается.

Адказны радактар
Б. М. Зельманаў

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5,14.

Упаўнаважаны абліта № 124. 1-я дзяржаўная друкарня у г. Беластоку.